**УДК 34.947.6**

# ВУЧЭННЕ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ АБ ПРАВАТВОРЧАСЦІ І ЯГО ЗНАЧЭННЕ ДЛЯ СУЧАСНАСЦІ

***д-р гіст. навук, праф. І.А. БАСЮК***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***

*Разглядаецца вучэнне Скарыны аб законе, аб прынцыпах, якім павінен адпавядаць закон, аб законе "прыроджаным" – натуральным праве, і законе "напісаным" – писаном праве, аб вяршэнстве натуральнага (боскага) права. Аналізуюцца найважнейшыя прававыя ідэі Францыска Скарыны аб супадзенні закона і права, аб суадносінах паміж маральнымі (чароўнымі) і юрыдычнымі законамі, аб адзінстве права для ўсіх саслоўяў Вялікага Княства Літоўскага. Даследуецца вучэнне Францыска Скарыны аб галінах права, практычнае прымяненне гэтага вучэння ў структурнай пабудове Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 года. Распрацаваныя Францыскам Скарынам прынцыпы праватворчасці маюць метадалагічны характар, яны адказваюць агульначалавечым каштоўнасцям, шмат у чым апярэджвалі свой час. Францыск Скарына ўнёс значны ўклад у еўрапейскую скарбніцу прававых вучэнняў. У святле вучэння Францыска Скарыны аналізуюцца некаторыя сучасныя праблемы праватворчасці – значэнне ювенальнай юстыцыі, шлюбных кантрактаў, легітымнасць аднаполых шлюбаў, погляды праваслаўнай царквы на гэтыя праблемы.*

***Ключавыя словы:*** *праватворчасць, натуральнае права, галіны права, маральныя і юрыдычныя законы, ювенальная юстыцыя.*

У беларускай гістарыяграфіі няма ніводнай навуковай працы (манаграфіі, нават артыкула), спецыяльна прысвечаный аналізу метадалагічных прынцыпаў праватворчасці, распрацаваных Францыскам Скарынай, беларускім вучоным і асветнікам, мысліцелем і правазнаўцай эпохі Адраджэння.

Францыск Скарына быў высокаадукаванай асобай свайго часу, адукацыю ён атрымаў у Полацку (магчыма, у Вільні), вучыўся ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве. У актавым запісу Падуанскага ўніверсітэта (Італія) ад 9 лістапада 1512 года запісана, што Францыск Скарына "был экзаменован в особо строгом порядке по вопросам, предложенным ему утром этого дня. Он проявил себя столь славно и достойно во время этого своего строгого экзамена, когда излагал ответы на заданные ему вопросы и когда опровергал предложенные ему доказательства, что получил единодушное одобрение всех присутствующих ученых без исключения и было признано, что он имеет достаточные знания в области медицины" [1, с. 586]. Скарына атрымаў вучоную ступень доктара медыцыны (лекарскіх навук) і адпаведныя на той час знакі доктарскай ступені: чырвоны круглы берэт, пярсцёнак, кнігу афарызмаў Гіпакрата ці Біблію [1, с. 602]. Скарына быў і доктарам свабодных мастацтваў (вольных навук), аб гэтым сведчыць вышэй упамянуты актавы запіс Падуанскага ўніверсітэта, у якім запісана, што зкзаменаваўся "...именитый доктор искусств господин Франциск, сын покойного господина Луки Скорины из Полоцка, русин..." [1, с. 586]. Такім чынам, актавы запіс сведчыць, што ўжо ў 1512 годзе Скарына быў "...именитый доктор искусств...", але дзе ён атрымаў гэтую ступень невядома [1, с. 602]. У энцыклапедычным слоўніку Ф.А. Бракгаўза і І.А. Эфрона Францыск Скарына ўпамінаецца толькі як доктар медыцыны (лекарскіх навук). Прафесар Я.А. Юхо лічыць, што Францыск Скарына меў не толькі вучоныя ступені доктара медыцыны і доктара мастацтваў, але і *доктара права* [2, с. 163].

Пасля атрымання вучонага звання доктара медыцыны перад Скарынай паўстала праблема: чаму прысвяціць сваё дальнейшае жыццё – лекарскай справе ці ўмацаванню духа народа – зрабіць даступнае для народа Святое Пісанне – кнігі Бібліі. На першым жыцёвым шляху Скарыну як урача і навукоўца чакалі матэрыяльны дастатак і павага. Уявім сабе: калі б і сёння нам прапанавалі набыць, скажам, "Лячэбнік Скарыны", многія набылі б, бо цікава, як і чым лячыліся нашы землякі стагоддзі назад. Але Скарына выбраў для сябе цярністы і пакручасты шлях, ён прысвяціў сваё жыццё асветніцкай дзейнасці, каб зрабіць даступнымі для народа кнігі Бібліі. Чаму менавіта асветніцкі шлях выбраў Скарына? Магчыма, з разумення ролі і значэння Бібліі. "В сей книзе, – пісаў Скарына аб Бібліі, – вси законы и права, ими же люде на земле справоватися имають, нописаны суть. В сей книзе лекарства душевные и телесные зуполне знайдете" [1, с. 9].

Пры падтрымцы віленскага бургамістра Якуба Бабіча, радцаў Багдана Онькава і Юрыя Адверніка Скарына ў 1517–1519 гадах у Празе выдаў 23 кнігі Бібліі на старажытнабеларускай мове пад агульнай назвай "Бівлія руска выложена доктором Франциском Скориною из славного града Полоцька, богу ко чти и людем посполитым к доброму научению". Да выдадзеных ім кніг Бібліі Скарына склаў прадмоў'е ці пасляслоў'е, у якіх выклаў сваё разуменне боскіх запаветаў, свае грамадска-філасофскія, маральна-этычныя, эстэтычныя і прававыя погляды. Прававыя погляды найбольш абагульняюча Скарына выклаў у прадмоў'і да выданнай ім кнігі Маісея "Второзаконие".

Такім чынам, захавалася значная творчая спадчына Скарыны, якая нам дае падставу для ўсебаковага выучэння яго навуковых ідэй і светапогляду. Уклад Скарыны ў навуковую скарбніцу аказаўся такім

значным, што запатрабавалася новая навуковая дысцыпліна – *скарыназнаўства*, якая комплексна вывучае жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны, яго творчую і духоўную спадчыну, асяроддзе, эпоху, публікацыю крыніц і крыніцазнаўчыя даследаванні. У Мінску была апублікавана фундаментальная праца на беларускай (1988 г.) і рускай мовах (1990 г.) – энцыклапедычны даведнік "Францыск Скарына і яго час", які ўключае грунтоўны навуковы нарыс аб жыцці і светапогляду Скарыны, фотаздымкі яго прадмоў і пасляслоўяў да выданых ім твораў і іх адаптаваны тэкст, дакументы аб Скарыне, спіс літаратры аб яго дзейнасці. Маецца значная навуковая літаратура аб Скарыне. Яго жыццю і творчасці прысвяцілі свае творы М. Алексютовіч, С. Падокшын, В. Конан, А. Мальдзіс, І. Дварчанін, Г. Галенчанка, Я. Юхо, Ф. Сокал і іншыя.

Разам з тым многія старонкі жыцця і творчасці Францыска Скарыны застаюцца малавядомымі ці зусім невядомымі. Так, і сёння даследчыкам невядомы дакладныя даты яго нараджэння і смерці, гэта прымусіла нават у энцыклапедычных выданнях указваць год нараджэння "каля 1490", год смерці "каля 1551" [3, с. 309], (годы, калі ў дакументах упершыню ці ў апошні раз упаміналася прозвішча Скарыны). Невядома і месца пахавання Скарыны [3, с. 311]. Мала даследаванымі застаюцца і прававыя погляды Скарыны, асабліва, яго ідэі аб праватворчасці.

Мэта нашай працы ў нейкай меры запоўніць існуючыя прабелы, паспрабуем раскрыць некаторыя *праблемы вучэння Скарыны аб праватворчасці* і паказаць яго значэнне для сучаснасці.

Скарыназнаўства, нягледзячы на існуючыя недахопы, усё ж шмат чаго зрабіла па вывучэнні навуковай спадчыны Скарыны. Маюцца ўсе падставы сцвярджаць, што Францыск Скарына валодаў сваёй сістэмай поглядаў і навуковых перакананняў, у тым ліку і па праву, таму, на наш погляд, можна гаварыць аб *вучэнні Скарыны аб праве і праватворчасці.*

Даследчыкі справядліва адзначаюць: свет для Скарыны – гарманічная сістэма, якая дзейнічае па законах разумнай мэтазгоднасці. Грамадства, на яго погляд, частка гэтай сістэмы, якая кіруецца законам сумлення, справядлівасці. У прадмове да выданай ім кнігі Бібліі "Эсфір" Скарына выклаў вершам сутнасць гэтага закона:

Не копай под другом своим ямы,
Сам ввалишся в ню.
Не став, Амане, Мардохею шибенице,
Сам повиснеш на ней.

У памяць уратавання яўрэяў ад гібелі, аб чым апавядае кніга Бібліі «Эсфір», устаноўлена свята «Пурым», якое святкуецца яўрэямі і ў нашы дні.

У творчай спадчыне Скарыны значнае месца займаюць *праблемы праватворчасці*. Скарына шмат увагі надаваў *закону*, абгрунтаванню патрабаванняў да закону. У прадмоў'і да кнігі Бібліі "Второзаконие" ён вызначыў важнейшыя прававыя прынцыпы, якім павінен адпавядаць закон. На погляд Скарыны, закон павінен быць "…почтивый, справедливый, можный, потребный, пожиточный подле прирожения, подлуг обычаев земли, часу и месту пригожий, явный, не имея в собе закритости, не к пожитку единого человека, но к посполитому доброму написаный" [1, с. 138].

Такім чынам, на думку Скарыны, закон павінен адпавядаць прынцыпу справядлівасці, звычаям, часу і месцу, не мець закрытасці, служыць не карысці аднаго чалавека, а для карысці ўсіх людзей, дзяржавы.

Справядлівасць, паводле Скарыны, з'яўляецца боска-прыродным маральным паняццем, а чалавекалюбства – галоўны крытэрый маральных паводзін чалавека. Менавіта на базе чалавекалюбства і справядлівасці Скарына сфармуляваў свой маральны імператыў, на якім павінны грунтавацца не толькі маральныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі, але і асноўвацца законы, правасуддзе, дзяржаўнае кіраванне і палітыка.

Скарына пісаў, што "людьское естество двояким законом бываеть справовано от господа бога, то ест прироженным, а написанным" [1, с. 136]. Такім чынам, Скарына падзяляў права на закон "прироженый" – натуральнае права, закон "написанный" – пісанае права. "Закон прироженный в том наболей соблюдаем бываеть, – адзначаў Скарына, – то чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего сам не хощеши от иных имети" [1, с. 136].

На погляд Скарыны, натуральнае права (закон "прироженный"), гэта закон божы, сфармуляваны Ісусам Хрыстом у Нагорнай пропаведзі: "Итак во всем, как хотите, чтобы с вами поступали люди, так поступайте и вы с ними; ибо в этом закон и пророки" (Евангелие от Матфея, 7:12).

На думку Скарыны, калі закон "прироженный" – гэта закон божы, у такім выпадку ён павінен мець вяршэнства над "пісаным" правам, выступаць зыходным у праватворчасці людзей. Пры такім падыходзе закон будзе справядлівым, бо ў ім нельга "…того не чинити иным, чего сам не хощеши от иных имети" [1, с. 136].

Скарына лічыў, што "яко праведнаму закон не ест положен" [1, с. 138], ці, іншымі словамі, – чалавек добры можа жыць і без прававых прадпісанняў, бо ён жыве па вышэйшых боскіх (маральных) запаветах і нормах. Чалавек злы парушае законы і прававыя прадпісанні, таму для такіх людзей, каб стрымаць іх злыя справы, менавіта і патрэбны законы. "И вчинены суть права, или закон, – пісаў Скарына, – для людей злых, або боячися казни, усмирили смелость свою и моци не имели иным ушкодити" [1, с. 138].

Скарына ў сваіх творах адзначаў, што законы выдаюць старэйшыны і мудрыя правіцелі. *Заканадаўчая дзейнасць*, на яго погляд, найвышэйшае прызванне ўладара, бо закон уладкоўвае ўзаемаадносіны паміж саслоўямі і асобнымі грамадзянамі, дае грамадзяніну сэнс жыцця і суладнасць. Прыклады ўзорных

правіцеляў-заканадаўцаў Скарына знаходзіць у антычным свеце (Салон, Лікург, Нума Пампілій), для хрысціян ён ставіў за ўзор Майсея і Саламона.

Скарына адстойваў *прынцып – адзінства права для ўсіх саслоўяў*, гэты прынцып быў замацаваны ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1529 года, у якім запісана: “иж вси подданыя наши, так вбогие, яко и богатые, которого роду колве або стану были бы, ровно а одностайным тем писаным правом сужоны быти” (разд. 1, арт. 9).

Некаторыя даследчыкі справядліва сцвярджаюць, што Скарына выказаў геніяльную здагадку аб супадзенні закона і права. Вядома, што ўспрыйманне права як інстытута, прызначанага для рэгулявання найбольш значных грамадскіх адносін, звязваецца з усеагульнымі каштоўнасцямі – справядлівасцю, гуманнасцю, маральнасцю і інш. Менавіта гэтыя каштоўнасці павінны выступаць крытэрыем ацэнкі заканадаўчых актаў з пункту погляду іх адпаведнасці праву [4, с. 59].

Значным укладам Скарыны ў тэорыю і практыку праватворчасці з’яўляецца прапанаваны ім *падзел права на галіны права* – выдзяляць адасобленыя групы прававых норм і інстытутаў, аб’яднаных агульнасцю рэгулюемых імі аднародных грамадскіх адносін. Ён выклаў сваю *класіфікацыю земскага права*, якое, на яго погляд, складаецца з нормаў (галін) права:

- *грамадзянскага і сямейнага* права (“…яко мужа и жены почтивое случение, детей пилное выхование, близко живущих схожение, речи позыченое навращение, насилию силою отпрение, ровная свобода всем, общее имение всех” [1, с. 139];

- *міжнароднага* (“язычеcкого”) права (“Другое право – языческое, от многих убо языков ухвалено ест, яко земель чужих мечем доставание, градов и мест утвержение, послов без переказы отпущение, миру до часу прирченого выполнение, войны неприятелем своим оповедание” [1, с. 139];

- *дзяржаўнага* права (“Иное – царское. О нем же пишеть Самуил, глаголя: «Тое будет право царево – побереть сыны ваша и наделаеть с них езцев и гонъцев, и встановить собе воеводы и сотники, и ратае поль своих, и коваче зброй своих»” [1, с. 139];

- *вайсковага* права (“Некое же право – рицерское или военное, еже на войне соблюдаемо бываеть. Яко справовати полки, знати своя места, разумети глас труб, делити користи, давати оброки…” [1, с. 140];

- *крымінальнага, мясцовага, гандлёвага, марскога і іншага права* (“Иное пак право местъское, иное морское, а иное купецькое…” [1, с. 140; 4, с. 58, 59].

*Вучэнне Скарыны аб падзелу земскага права на асобныя галіны* было выкарыстана ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1529 года, дзе была зроблена спроба размяжаваць нормы права паміж асобнымі яго галінамі. Статут складаецца з 13 раздзелаў, якія падзяляюцца на артыкулы. Аналіз структуры і зместу Статута паказвае, што нормы права размешчаны па групам (раздзелам Статута), якія шмат у чым нагадваюць галіны права. У 1–3-м раздзелах змешчаны ў асноўным нормы дзяржаўнага, ваеннага і іншых галін права, у 4 і 5-м – шлюбна-сямейнае, апякунскае і спадчыннае, у 6-м – судова-працэсуальнае, у 7-м – крымінальнае, 8-м – зямельнае, у 9-м – лясное і паляўнічае, у 10-м – цывільнае, у 11–13-м – крымінальнае і крымінальна-працэсуальнае. Для справядлівасці адзначым, у Статуце 1529 года яшчэ няма строгага падзелу нормаў права на галіны права, бо скажам, мы ў кожным раздзеле можам заўважыць нормы і крымінальнага, і адміністрацыйнага, і грамадзянскага, і дзяржаўнага права. І ўсё ж справядлівым будзе адзначыць, што Францыск Скарына значна апярэдзіў свой час, яго падзел нормаў права на галіны права ўнёс значную ўпадкаванасць у праватворчы працэс, якасна палепшыў законатворчасць. Падзел права на галіны і зараз выкарыстоўваецца як у Рэспубліцы Беларусь, так і ў краінах Еўропы, у Расійскай Федэрацыі, у іншых краінах свету.

Але як дабіцца прыняцця справядлівых і патрэбных людзям законаў, якія, па вызначэнні Скарыны, былі б “…не к пожитку единого человека, но к посполитому доброму написаный” [1, с. 138]. Каб вырашыць гэтую складаную праблему, Скарына ў прадмовах і пасляслоў’ях да кніг Бібліі выклаў *канцэпцыю суадносін паміж маральнымі (боскімі) і юрыдычнымі законамі.* Асновай маральных законаў Скарына лічыў боскія запаветы. Кожны народ, на падставе дадзеных Богам запаветаў, прымае юрыдычныя законы сваёй дзяржавы. Адыход заканадаўства дзяржаў ад боскіх запаветаў цягне за сабой «вразумление народов» – войны, грамадскія хваляванні, бунты, паўстанні, эпідэміі і іншыя няшчасці. Калі грамадства і дзяржава зноў звяртаюцца да божых запаветаў, кладуць іх у аснову свайго заканадаўства, тады ў грамадства і дзяржаву вяртаюцца супакой, стабільнасць, павага да ўладаў, грамадскіх і дзяржаўных інстытутаў, змяншаецца злачыннасць, павышаецца дабрабыт насельніцтва.

На наш погляд, метадалагічныя падыходы Скарыны і сёння могуць шмат чаго растлумачыць. Нагадаем падзеі ў Германіі з прыходам да ўлады Гітлера і яго фашысцкай партыі. Што даў фашызм Свету і нямецкаму народу? Жудасную Другую сусветную вайну, гібель мільёнаў людзей, разруху гаспадаркі, падзенне жыццёвага ўзроўню людзей, жорсткія законы ваеннага часу, разгул злачыннасці, нехватку самага неабходнага для паўсядзённага жыцця – жылля, ежы, вопраткі, лякарстваў… Пасля вайны нямецкі народ знайшоў у сабе сілы асудзіць фашызм, і жыццё ў Германіі карэнным чынам змянілася: зараз Германія – цывілізаваная дзяржава свету, з высокім жыццёвым узроўнем насельніцтва, у якой пануе грамадская стабільнасць і дабрабыт.

Але і сёння, на наш погляд, калі дзяржавы адступаюць у сваім заканадаўстве ад духу боскіх запаветаў, яны сустракаюцца са значнымі сацыяльнымі супярэчнасцямі. Возьмем, для прыклада, *ювенальную*

*юстыцыю*, якой належыць вырашаць праблемы непаўналетніх. У краінах з'явіліся ўпаўнаважаныя па правах дзіцяці, інстытут ювенальнага суда з адпаведнымі органамі ювенальнай юстыцыі, інфрастуктура сацыяльных устаноў, органы апекі, тэлефоны даверу са штатам сваіх работнікаў, іншыя арганізацыі. Правы дзяцей атрымалі прыярытэт над правамі ўсіх астатніх катэгорый грамадзян. Зараз у некаторых краінах існуе практыка поўнай адмены пакаранняў непаўналетніх, нават за ўчыненыя імі крымінальныя злачынствы [5]. Дзецям дазволена амаль усё, а любыя спробы пакарання іх бацькамі разглядаюцца як парушэнні правоў дзіцяці, што цягне за сабой аж пазбаўленне бацькоўскіх правоў і нават прыцягненне бацькоў да крымінальнай адказнасці.

І якія *вынікі прымянення ювенальнай юстыцыі*? Даследаванні паказваюць, што ні ў воднай краіне свету ювенальная юстыцыя не прывяла да змяншэння дзіцячай злачыннасці, наадварот, па статыстыцы нават у стабільных скандынаўскіх краінах з развітай ювенальнай сістэмай, дзіцячая злачыннасць за апошнія гады ўзрасла амаль у 20 разоў [5]. У юрыдычнай і педагагічнай літаратуры адзначаны цэлы комплекс негатыўных праблем, якія выклікала ювенальная юстыцыя. Чаму так атрымалася? На наш погляд, адбылося тое, аб чым папярэджвалі яшчэ ў XVI стагоддзі беларускія мысліцелі: узаемная любоў і павага паміж бацькамі і дзецьмі ювенальная юстыцыя падмяніла халодным законам, абаронай дзяцей ад… іх жа бацькоў. Такая падмена і прывяла да разгула злачыннасці непаўналетніх, іх маральнай разбэшчанасці, да фактаў алкагалізма і наркаманіі. Адыход ад боскіх запаветаў у выхаванні непаўналетніх абярнулася відавочнымі негатыўнымі з'явамі, гэта выклікала ў многіх краінах справядлівую крытыку ювенальнай юстыцыі, шмат якія з краін адмовіліся ад яе ўвядзення ў поўным аб'ёме па заходняму ўзору [5].

Ці возьмем, для прыклада, *шлюбные кантракты*, якія вызначаюць маёмасныя правы і абавязкі мужа і жонкі ў шлюбе ці ў выпадку скасавання шлюбу. Напрыклад, у Расійскай Федэрацыі, шлюбны кантракт распаўсюджваецца толькі на сферу маёмасных адносін мужа і жонкі; асабістыя іх адносіны, ці адносіны з дзецьмі ўмовы шлюбнага кантракта вызначаць не могуць [6]. Ці больш моцнымі сталі сем'і на падмурку шлюбных кантрактаў? Статыстыка разводаў (распадаў) маладых сем'яў гаворыць аб іншым. На наш погляд, асноўная прычына сямейных разладаў у тым, што людзі адступілі ад боскага запавета ўзаемнай любові (кахання, сардэчнай прыхільнасці, замілавання), падмянілі яго халодным гаспадарчым разлікам у адносінах жонкі і мужа. Якія маральныя адносіны могуць быць у сем'ях, дзе пануе не ўсеагульная любоў (сардэчная прыхільнасць), а кантракт, матэрыяльны разлік? Якія маральныя жыццёвыя ўрокі атрымаюць у такіх сем'ях дзеці?

Ці ўзгадаем праблему *аднаполых шлюбаў*, да якіх адназначна адмоўна ставяцца як Праваслаўная, Каталіцкая, так і Мусульманская цэрквы. Але некаторые краіны легалізавалі аднаполыя шлюбы; па выразу патрыярха Кірыла – "И вот мы дожили до времен, когда грех подкрепляется нормой закона, а значит, и силой власти" [7].

У "Асновах сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай царквы" запісана: "…в Десятисловии ясно сказано: "Почитай отца твоего и мать твою" (Исх. 20.12). Любая противоречащая этой заповеди светская норма делает преступником не нарушителя ее, а самого законодателя" [8, с. 23]. Далей у Канцэпцыі адзначана: "Однако в тех случаях, когда человеческий закон совершенно отвергает абсолютную божественную норму, заменяя ее противоположной, он перестает быть законом, становясь беззаконием, в какие бы правовые одежды он не рядился" [8, с. 23]. На погляд Рускай праваслаўнай царквы, "Задача светского закона – не в том, чтобы лежащий во зле мир превратился в Царствие Божие, а в том, чтобы он не превратился в ад" [8, с. 22].

Аналіз прававых ідэй Францыска Скарыны дазваляе зрабіць вывад аб яго гуманістычных прававых поглядах і аб значным укладзе, унесеным ім у прававую навуку. На думку прафесара Я.А. Юхо, супастаўленне прававых ідэй Скарыны і зместа Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 года дае падставу меркаваць аб яго удзеле ў падрыхтоўцы праекта Статута. Гэтае меркаванне, на погляд Я.А. Юхо, пацвярджаецца яшчэ і тым, што ўрад меў намер выдаць Статут друкарскім спосабам [2, с. 163].

Скарына быў не толькі вучоным-правазнаўцам, але і юрыстам-практыкам. Ён неаднаразова выступаў у судах у абарону як сваіх уласных інтарэсаў, так і сваіх блізкіх. Так, у пачатку 1530-х гадоў ён выступаў у якасці ўладальніка спадчыны сваёй жонкі ў віленскім судзе, затым у судзе віленскага епіскапа і ў гаспадарскім (вялікакняскім) судзе [1, с. 425].

Духоўная спадчына Скарыны была асэнсавана, успрынята і ў значнай ступені развіта наступнымі пакаленнямі выдатных беларускіх мысліцеляў, гуманістаў-асветнікаў і прававедаў.

У якасці **агульнага вывада** адзначым: і сёння не страцілі сваёй значнасці і актуальнасці шмат якія прынцыпы вучэння Скарыны аб праватворчасці, бо яны адпавядаюць агульначалавечым каштоўнасцям, шмат у чым апярэджвалі свой час; прававое вучэнне Скарыны ўнесла значны ўклад у еўрапейскую скарбніцу прававых вучэнняў.

Удзячны беларускі народ шануе памяць Францыска Скарыны. Імем Скарыны названы вуліцы ў Полацку, Віцебску, Нясвіжы, Оршы, Слуцку і іншых гарадах, Гомельскі дзяржаўны універсітэт.

Помнік Скарыне пастаўлены ў Полацку, Лідзе, Мінску, Вільнюсе. Уведзены дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь – медаль Скарыны (1989 г.) і ордэн Скарыны (1995 г.) [3, с. 315].

Такім чынам, можна канстатаваць, што рэалізавана мэта працы – выкладзены некаторыя праблемы вучэння Францыска Скарыны аб праватворчасці, паказана іх значэнне для сучаснасці. Навуковая навізна даследавання ў некаторай меры папаўняе існуючыя прабелы ў вывучэнні творчай спадчыны Францыска Скарыны аб праве і праватворчасці.

Матэрыялы, атрыманыя ў час даследавання, могуць прадстаўляць цікавасць для даследчыкаў гісторыі праватворчасці, а гэтак жа могуць быць выкарыстаны выкладчыкамі і студэнтамі юрыдычных і іншых спецыяльнасцей, магістрантамі і аспірантамі, якія вывучаюць гісторыю палітычнай і прававой думкі Беларусі.

ЛІТАРАТУРА

1. Франциск Скорина и его время: энцикл. справ. / И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСЭ, 1990. – 613 с.
2. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 270 с.
3. Галенчанка, Г. Скарына / Г. Галенчанка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 6, кн. 1. – Мінск, 2001. – С. 309–315.
4. Басюк, І.А. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І.А. Басюк. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2011. – 282 с.
5. Что такое ювенальная юстиция? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.omiliya.ru. – Дата доступа: 14.11.2014.
6. Что такое брачный контракт и для чего он нужен? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: //www.aif.ru. – Дата доступа:14.11.2014.
7. «Неизвестный» Патриарх Кирилл. – М.: Даниловский благовестник, 2009. – С. 92.
8. Основы социальной концепции Русской Православной Церкви. – М., 2000. – 88 с.

*Пастурпіў 22.03.2016*

**THE DOCTRINE OF FRANTSISKA SKORYNY ABOUT LAWMAKING AND ITS VALUE FOR THE PRESENT**

***I. BASIUK***

*Article is devoted poorly investigated problem – to the doctrine of Frantsiska Skoriny about lawmaking. Are considered the doctrine of Skoriny about the law, on principles to which there should correspond the law, on the natural right, on leadership of the natural (divine) right. In article the major legal ideas of Frantsiska Skoriny about law and right coincidence, about a parity between moral (divine) and legal laws, on unity of the right for all estates of Grand duchy Lithuanian are analyzed. In article the doctrine of Frantsiska Skoriny about right branches, practical application of this doctrine in structural construction of the Statute of Grand duchy of the Lithuanian 1529 is investigated. The principles of lawmaking developed Frantsisky Skorinoj have methodological character, they answer universal values, in many respects advanced the time. Frantsisk Skorina has brought the considerable contribution to the European treasury of legal doctrines. In the light of the doctrine of Frantsiska Skoriny in article some modern problems lawmaking – value justices, marriage contracts, legitimacy of unisex marriages, sights of orthodox church at these problems are analyzed.*

***Keywords:*** *the lawmaking, the natural right, right branches, moral and legal laws, value justice.*